**Кузьмініч Т.В.**, *выкладчык*

# СТРУКТУРНЫ АНАЛІЗ СІСТЭМЫ БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ ІНФАРМАЦЫІ (БІ) ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Пад сістэмай бібліяграфічных дапаможнікаў, як правіла, маюць на ўвазе сукупнасць прадуктаў бібліяграфічнай дзейнасці, якая шматаспектна адлюстроўвае дакументальныя масівы (ДМ) і дакументальныя патокі (ДП) з улікам патрэбнасцей усіх груп карыстальнікаў. Сістэма бібліяграфічнай інфармацыі па гісторыі Беларусі (СБІГБ) знаходзіцца ў пастаянным руху. Для кожнага з этапаў яе развіцця характэрна існаванне пэўных структурных адзінак, тыпаў, відаў, жанраў бібліяграфічных дапаможнікаў.

У навуковай літаратуры выказваліся прапановы па класіфікацыі бібліяграфічнай прадукцыі па гісторыі. У большасці выпадкаў яны мелі лінейны характар, за выключэннем фасетнай класіфікацыі рэтраспектыўных дапаможнікаў па гісторыі СССР, распрацаванай Л.Л.Маянц. Мы прапануем аналіз структуры аптымальнай СБІГБ у адпаведнасці з філасофскімі катэгорыямі «змест і форма», «колькасць і якасць», «прастора і час».

Кожная сістэма мае сваё змястоўнае напаўненне і фармальнае праяўленне, дзе форма мадыфіцыруецца і змяняецца ў адпаведнасці са зменамі ў змесце. Пры аналізе структуры СБІГБ трэба зыходзіць са спецыфікі гістарычных ДМ і ДП, якія складаюцца з дзвюх вялікіх частак: гістарычных крыніц і гістарычных дакументаў (гістарычных па зместу). Яны па-рознаму адлюстроўваюць гістарычны працэс. Таму і БІ па гісторыі краіны неабходна першапачаткова раздзяліць у залежнасці ад спосабу адлюстравання мінулага аб'ектамі бібліяграфавання на дзве падсістэмы: дапаможнікі, якія ўлічваюць БІ аб гістарычных дакументах, і дапаможнікі, якія ўлічваюць БІ аб гістарычных крыніцах.

Змястоўную структуру першай падсістэмы можна ўявіць наступным чынам: дапаможнікі, прысвечаныя гісторыі Беларусі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў цэлым (агульнагістарычныя), пэўнаму перыяду гісторыі Беларусі, дапаможнікі па спецыяльных гістарычных навуках, па галіновых раздзелах гістарычнай навукі, па гістарычных раздзелах галін навукі, тэхнікі, культуры Беларусі, па дапаможных гістарычных дысцыплінах, тэматычныя бібліяграфічныя дапаможнікі, бібліяграфічныя дапаможнікі.

Змястоўны фасет немэтазгодна выдзяляць для бібліяграфіі гістарычных крыніц. Найбольш паслядоўнай уяўляецца класіфікацыя элементаў гэтай падсістэмы ў залежнасці ад унутранай і знешняй формы аб'ектаў бібліяграфавання, характару інфармацыі, формы запісу і іншых фармальных прымет. У бібліяграфічнай прадукцыі магчыма спалучэнне БІ аб гістарычных дакументах і гістарычных крыніцах. Таму можна прапанаваць класіфікацыйную схему, у якую ўключаны элементы ў залежнасці ад колькасці разнавіднасцей улічаных адзінак і аптымальная мадэль падсістэмы БС крыніц:

1. Дапаможнікі, якія ўлічваюць некалькі разнавіднасцей гістарычных дакументаў і крыніц.

2. Дапаможнікі, якія ўлічваюць адну разнавіднасць дакументаў ці крыніц.

2.1. Дапаможнікі, якія ўлічваюць гістарычныя крыніцы.

2.2. Дапаможнікі, якія ўлічваюць гістарычныя дакументы.

2.1.1. Дапаможнікі, якія ўлічваюць адну разнавіднасць крыніц.

2.1.2. Дапаможнікі, якія ўлічваюць некалькі разнавіднасцей крыніц.

2.1.1.1. Па матэрыяльнай канструкцыі.

2.1.1.2. Па ўнутранай форме аб'ектаў бібліяграфавання.

2.1.1.3. Па знешняй форме аб'ектаў бібліяграфавання.

БІ як сродак арганізацыі ДМ і першаснага ДП уключае адпаведныя часавым характарыстыкам дакументаў звёны: рэтраспектыўнае і бягучае. Крыніцы БІ адлюстроўваюць інфармацыю аб дакументах, прысвечаных гісторыі краіны ў цэлым ці асобнаму яе рэгіёну; утвараюцца краіназнаўчыя і краязнаўчыя звёны СБІ ГБ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Колькасныя характарыстыкі ўласцівы агульнагістарычнай бягучай і рэтраспектыўнай бібліяграфіі як сродку вымярэння ДП і ДМ. Колькасныя адносіны маюць месца і ў бібліяграфіі гістарычных крыніц. Якасная структура сістэмы фарміруецца ў адпаведнасці з неабходнасцю абслугоўвання пэўнай сацыяльнай сферы (навукі, вытворчасці, адукацыі, выхавання). Звёны яе заснаваны на асобных відах (ці іх сукупнасці) ацэнак дакументаў і прадстаўлены адпаведнымі групамі дапаможнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ